

## *“Ісці за Хрыстом”*

***Антоній Бокун**, пастар царквы “Ян Прадвеснік”*

**Мк.8:34-35** *“ І паклікаўшы людзей з вучнямі Сваімі, сказаў ім: хто хоча ісьці за Мною, зрачыся сябе, і вазьмі крыж свой, і ідзі за Мною сьледам; 35. бо, хто хоча душу сваю ўратаваць, той страціць яе; а хто страціць душу сваю дзеля Мяне і Дабравесьця, той уратуе яе”.*

***Калі мы хочам ісці за Хрыстом, мы павінны:***

***1. Адрачыся ад сябе.*** Адмовіцца ад свайго эгаізму, не чакаць як Госпад можа паслужыць мне, але як я магу паслужыць і праславіць Яго імя. Не шукаць свайго, адмовіцца ад таго, што я буду клапаціцца аб самім сабе.

***2. Узяць свой крыж і ісці за Хрыстом.*** У нашым уяўленні крыж – гэта пакуты, балезні, няшчасці. Але Бог гаворыць аб міссіі, прызначэнні ў жыцці чалавека. Бо Ісус прыйшоў у гэты свет, каб памерці на крыжы. Сын Божы стаў чалавекам, каб аддаць жыццё. Ягонай місіяй, прызначэннем быў крыж. Таксама і кожны з нас не нарадзіўся проста так, мы маем пэўнае прызначэнне ад Госпада.

Калі нехта думае, што працаваць для Царства Божага – гэта нешта лёгкае, вясёлае, то ён глыбока памыляецца. Кожны, хто працаваў для Царства, ведае, што гэта цяжкі, складаны, няпросты труд. Узяць свой крыж – гэта працаваць для Госпада. Будуць праблемы, выпрабаванні, але гэта звязана з тым, што ты служыш Госпаду.

Што значыць адрачыся ад сябе і ісці за Хрыстом? І што будзе, калі будзеш спрабаваць служыць сабе? Прыведзем некалькі прыкладаў з беларускай гісторыі пра тое, як дзейнічае гэтае слова.

Мікалаю Радзівілу Чорнаму ў 2015 годзе спаўняецца 500 гадоў са дня нараджэння. У гэтым годзе Белпошта выдала спецыяльны канвэрт, Нацыянальны банк Рэспулікі Беларусь надрукаваў спецыяльную манету у гонар 500-годдзя Мікалая Радзівіла Чорнага. Па Мінску мы бачым мноства бігбордаў з яго партрэтам. Чаму пра яго памятаюць?

Ён нарадзіўся ў 1515 годзе ў Нясвіжы, рана застаўся сіратою. Калі яму было 7 год, памерла маці, яшчэ раней - бацька. Дзядзька Юры Радзівіл выхоўваў яго ў сваёй сям’і. Пазней ён быў запрошаны каралём і вялікім князем Літоўскім Жыгімонтам Старым на двор у Кракаў і там выхоўваўся да 20 год. Пасля вярнуўся ў Беларусь і прыкладна у гэты час упершыню пазнаёміўся з евангельскай верай, пачуў евангельскіх прапаведнікаў. Гэта быў час, калі ў Нямеччыне пачынаўся рух Рэфармацыі, прыязджала шмат прапаведнікаў. Слухаючы іх, пакаяўся малодшы брат Мікалая – Ян Радзівіл, стаў евангельскім хрысціянінам. Але Мікалая Радзівіла гэта не цікавіла. Слухаючы прапаведнікаў Мікалай казаў: “вы добрыя людзі, добра гаворыце, вас цікава паслухаць, але гэта не маё, я не хачу станавіцца манахам”. Ён быў вельмі амбітным, хацеў быть знакамітым, марыў падняць свой род, зрабіць Нясвіж самым вядомым горадам у краіне. У яго былі ўсе магчамасці для гэтага. Здавалася, што Мікалаю Радзівілу не патрэбна, не цікава евангельская вера.

Здавалася, што яго спробы сваімі сіламі збудаваць славу атрымліваюць вынік. Ён сябраваў з будучым наследнікам ВКЛ Жыгімонтам Аўгустам. Калі Жыгімонт Аўгуст стаў вялікім князем Літоўскім, Радзівіл, яго бліжэйшы сябра, атрымаў вялікую пасаду - стаў спікерам парламента. Ягоная знакамітасць павялічылася, калі Жыгімонт Аўгуст пачаў сустракацца са стрыечнай сястрой Мікалая Барбарай Радзівіл. З аднаго боку гэта імпанавала Мікалаю,

але Жыгімонт Аўгуст меў славу блудніка. Гэтыя сустрычы нічога, акрамя жартаў і насмешак не нараджалі. Калі Жыгімонт Аўгуст прыйшоў у госці да Барбары, Мікалай Радзівіл Чорны і Мікалай Радзівіл Руды - браты Барбары, папярэдзілі, каб ён не сустракаўся з ёю, бо пайдуць плёткі, каб не пляміць род Радзівілаў.

Прайшоў час, Жыгімонт Аўгуст адчуваў, што гэта не проста чарговая закаханасць, а сур'ёзнае пачуццё. Калі ён думаў, што браты з'ехалі з горада, то прыйшоў да Барбары ў госці. А там замест Барбары яе два браты. Ён адказаў, што хоча жаніцца, таму што кахае іх сястру. У хуткім часе адбыўся патаемны шлюб, бацькам не сказалі. Каб паведаміць бацькам, Мікалай Радзівіл Чорны паехаў у Кракаў. Гэта выклікала скандал, таму што слухі ўжо дайшлі. Таксама ён паехаў у Германію, каб атрымаць тытул князя, падняць свой статус і каб Барбара стала княгіняй.

Калі Жыгімонт Аўгуст Стары памірае, яго сын Жыгімонт Аўгуст становіцца не толькі вялікім князем Літоўскім, але і каралём польскім. Паўстае пытанне пра каранацыю Барбары. Тады ўвесь сенат польскага каралеўства стаў на калені перад Жігімонтам Аўгустам, просячы развесціся з "няправільнай" жонкай. Жігімонт Аўгуст за тыя гады, калі быў у шлюбе з Барбараю, моцна змяніўся. Ён сказаў: "Паны браты, калі я абяцаў перад Госпадам быць верным маёй жонцы ў шчасці і няшчасці, у здароўі і хваробе, а вы заклікаеце мяне адмовіцца ад гэтага абяцання, то чаго будуць вартыя ўсе мае словы, сказаныя вам, калі я Госпаду не стрымаю абяцанне, калі буду няверным маёй жонцы, чаго выртыя мае ўказы і законы?". Праз нейкі час Барбара Радзівіл стала каралевай. Мікалай Радзівіл стаў канцлерам – прэм'ер-міністрам.

У гэты момант, на піку славы ўсё пачало рушыцца. У траўні 551 года раптоўна захварэла і памерла Барбара. Праз некалькі месяцаў памірае малодшы брат Мікалая Радзівіла Чорнага, Ян Радзівіл. Ва ўсёй гэтай сітуацыі Мікалай Радзівіл Чорны спыніўся і задумаўся, ён звяртаецца да Святога Пісання, узгадвае чутае ад прапаведнікаў, схіляецца прад Богам, разумее, што слава чалавека – пустое. Праз некалькі месяцаў ён абвясціў, што з'яўляецца евангельскім хрысціянінам. У гэты час ён займаў вялікі пост у княстве, быў другім чалавекам пасля вялікага князя, але па тагачасных законах мог займаць дзяржаўныя пасады толькі католік. Частка людзей падтрымала яго, але многія выступілі супраць. Нават жонка рэзка выступала супраць, некалькі год яна не прымала яго рашэння.

Мікалай Радзівіл Чорны запрашаў на набажэнства Жігімонта Аўгуста, але ён не прыехаў. Мікалай аддаў палову свайго палацу, каб там праходзілі набажэнствы. 20 год, нават пасля яго смерці, царква збіралася там. Паявіліся размовы, што Мікалаю Радзівілу Чорнаму трэба адсекчы галаву, тады ўсе пытанні з евангельскай верай супыняцца. Але Радзівіл пачаў шукаць того, што ўгодна Богу, астаўся Яму верным, ён перастаў траціць свае сілы і сродкі дзеля славы свайго роду, пачаў укладаць грошы ў будаванне цэркваў, выданне евангельскіх кніг, адчыніў дзве друкарні. Найбольш вядомая – друкарня ў Берасце, дзе была надрукавана Берасцейская Біблія на польскай мове, на якую ён аддаў гадавы даход усіх сваіх уладанняў. Катэхізіс у Нясвіжы, фатаграфія тытульнай старонкі якога ёсть сягодня у кожным падручніку па гісторыі. Праз некаторы час ягоная жонка, гледзячы на прыклад яго жыцця, скарылася перад Госпадам. У гэты час у іх нарадзіўся сын Ян, які праз некалькі месяцаў памёр. Але Мікалай Радзівіл Чорны быў цверды ў тым, каб ісці за Госпадам і гэта прынесла плён. Час яго кіравання ўвайшоў у гісторыю як залаты век Беларусі, найбольшы ўздым краіны, эпоха Рэфармацыі. Сёння яго памятаюць як вялікага рэфарматара, пра яго ўзгадваюць на дзяржаўным узроўні, у Берасце стаіць яго помнік.

Гісторыя паказывае, што кожны раз, калі мы сустракаемся з нейкімі праблемамі, складанасцямі, гэта пытанне для нас: што ты будзеш рабіць? Ці ты станеш на калені і скажаш: Госпадзі, рабі тое, што Ты жадаеш у маім жыцці, я хачу ісці за Табою! Ці наадварот, ты закрыешся ад Госпада і заглыбішся у свае праблемы.

Жыгімонт Аўгуст таксама перажыў сур’ёзнейшую згубу у сваім жыцці, але не зрабіў выбар ісці за Госпадам. Калі Бабрара захварэла, ён адзіны быў побач, бо ніхто не хацеў сядзець з ёю, даглядаць яе. Яе апошняй просьбай было каб яе пахавалі ў Вільні. Калі яна памерла, яе цела амаль два месяцы вязлі з Кракава у Вільню. Жыгімонт Аўгуст пехатою ішоў за труной. Настолькі было сур’ёзнае патрасенне, але ён застаўся са сваёй праблемай. Ён увесь час шукаў як знайсці тое каханне, якое згубіў і не знаходзіў.

Мікалай Радзівіл Чорны, сутыкнуўшыся з выпрабаваннем, не стаў шкадаваць сябе, але пайшоў за Госпадам. І якая вялікая розніца! Тое, пра што марыў Мікалай Радзівіл Чорны, калі яшчэ не быў з Госпадам, споўнілася. Сёння ён вядомая асоба. Ён хацеў, каб яго род быў вядомы, але ён вядомы не тым, што зрабіў сам, але што Госпад зрабіў праз яго. Нясвіж, які ён хацеў зрабіць вядомым городам, сёння вядомы ва ўсёй Беларусі. Ён не збудаваў ні воднага палацу, ён усе свае сродкі ўкладаў у кнігі, цэрквы, прапаведнікаў і сёння мы памятаем пра Мікалая Радзівіла Чорнага.

Жыгімонт Аўгуст, які хацеў запоўніць унутраную пустату, і не хацеў ісці за Госпадам, увайшоў у гісторыю як уладар страчаных магчымасцей. Ён меў вялікія магчымасці, але не скарыстаўся імі. Ён заўсёды ўсё адкладаў на заўтра, а гэтае заўтра ніколі не наступала.

Два чалавекі, якія апынуліся перад сур’ёзнымі выпрабаваннямі, зрабілі розны выбар. Адзін схіліў калені прад Госпадам, другі – не захацеў.

Кожны з нас сутыкаецца з праблемамі, выпрабаваннямі. Кожная сур’ёзная праблема – заўсёды шанец для Госпада ўвайсці ў тваё жыццё. Ісус кажа: *“хто хоча ісьці за Мною, зрачыся сябе, і вазьмі крыж свой, і ідзі за Мною сьледам”.*

Кожны раз, калі цяжка, трэба ісці за Ісусам, рабіць тое, што добра для Яго. Куды ты ідзеш і што ты будзеш рабіць? Ці ты будзеш слухаць Госпада, ці закрыешся і заглыбішся ў свае праблемы. Усякія праблемы – гэта стук Госпада ў тваё сэрца. Ці ты гатовы яшчэ далей ісці за Господам?

Калі ты даверыш сваё жыццё Госпаду, Ён будзе выводзіць цябе на новыя вяршыні. Калі будзеш спрабаваць вырашыць сам - цябе чакае тупік.

Калі сёння ты перажываеш нейкія складанасці, маліся, каб мець сілу адрачыся ад сябе, узяць свой крыж і ісці за Хрыстом, бо хто згубіць душу сваю, той здабудзе яе.